**Рудовіч Станіслаў Сцяпанавіч**

*Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (Мінск, Беларусь)*

# УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД 1917 ГОДА: СПРОБА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАНСАЛІДАЦЫІ ПЕРАД ТВАРАМ КАТАСТРАФІЧНЫХ ПАГРОЗ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Скліканне ў канцы 1917 г. Усебеларускага з'езда было прадыктавана цяжкім, драматычным становішчам Беларусі ва ўмовах усеабдымнага рэвалюцыйнага крызісу Расійскай дзяржавы. Над краем навіслі пагрозы, якія неслі ў сабе патэнцыяльную катастрофу для яго насельніцтва.

Кастрычніцкі пераварот 1917 г. паскорыў дэзынтэграцыйныя працэсы ў былой імперыі Раманавых. У лістападзе 1917 г. была абвешчана Украінская Народная Рэспубліка і ўзяты курс на ўтварэнне Латвійскай дзяржавы, што аб'ектыўна спараджала праблему беларуска-украінскага і беларуска-латвійскага тэрытарыяльнага размежавання. На заходнюю, акупаваную немцамі частку Беларусі (Віленшчыну і Гродзеншчыну) прэтэндавалі Літоўская Тарыба і польскія палітыкі. Існавала небяспека, што ў ходзе прызначаных у Брэсце мірных перамоў з дзяржавамі германскага блоку Савецкая Расія адмовіцца ад дадзеных тэрыторый. Гэта азначала б міжнародна-прававое замацаванне падзелу Беларусі, страту ёю тэрытарыяльнай цэласнасці.

Сур'ёзную пагрозу для Беларусі стваралі размешчаныя тут арміі расійскага Заходняга фронту, якія знаходзіліся ў стане інтэнсіўнага распаду. Натоўпы ўзброеных салдат самавольна пакідалі фронт і разыходзіліся па прылеглых тэрыторыях, учыняючы рабаўніцтва і гвалт над мясцовым насельніцтвам. Расійскае войска на тэрыторыі Беларусі страціла функцыі абаронцы краіны і стала адным з фактараў, які пагражаў будучыні беларускага народа [6, с. 27—36]. Сітуацыя яшчэ больш ускладнялася дзеяннямі 1-га польскага корпуса пад камандаваннем Ю. Доўбар-Мусніцкага. Ва ўмовах нарастання аграрнай рэвалюцыі часці корпуса станавіліся на абарону памешчыкаў, учынялі над беларускімі сялянамі жорсткія расправы.

У такіх умовах востра актуалізавалася неабходнасць самаарганізацыі Беларусі як асобнай адміністрацыйна-дзяржаўнай адзінкі і фарміравання агульнабеларускіх органаў улады, якія маглі б мабілізаваць насельніцтва краю на абарону яго жыццёвых інтарэсаў.

Утвораныя ў Мінску ў лістападзе 1917 г. органы савецкай улады — Аблвыкамзах і Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту — не валодалі для гэтага дастатковай легітымнасцю і кампетэнцыяй. Яны з'яўляліся па-сутнасці франтавымі структурамі, укамплектаванымі вайскоўцамі пераважна немясцовага паходжання. Бальшавікі, што ўзначалілі гэтыя органы, былі апантаны ідэямі сусветнай рэвалюцыі і прымітыўна трактаванага інтэрнацыяналізму; вырашэнне злабадзённых праблем краю ў інтарэсах яго карэнных жыхароў не ўяўлялася для іх першачарговай мэтай.

Задачу дзяржаўна-палітычнага канстытуявання Беларусі, распрацоўкі неадкладных мер па пераадоленню крызісу і ўтварэння аўтарытэтных уладна-адміністрацыйных структур быў заклікан вырашыць агульнанацыянальны прадстаўнічы форум — Усебеларускі з'езд.

Асноўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі з’езда сталі два палітычныя цэнтры — Вялікая Беларуская рада (з падпарадкаванай ёй Цэнтральнай Беларускай вайсковай радай) у Мінску і Беларускі абласны камітэт у Петраградзе. Гэтыя арганізацыі рэпрэзентавалі дзве асноўныя культурна-ідэалагічныя плыні, што суадносілі сябе з беларускай этнічнай супольнасцю і прэтэндавалі на выказванне яе інтарэсаў — уласна беларускую («адраджэнцкую») і «заходнярускую». Яны па-рознаму вызначалі месца беларусаў у сістэме этнанацыянальных адносін у еўрапейскай частцы былой Расійскай імперыі і, адпаведна, па-рознаму праграмавалі дзяржаўна-палітычную і культурную будучыню Беларусі.

Вялікая Беларуская рада (старшыня В. Адамовіч) гуртавала вакол сябе носьбітаў нацыянальнай ідэі, галоўным чынам прыхільнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады. У фокусе іх зацікаўленняў была найперш сама Беларусь, спосабы яе дзяржаўна-палітычнага ўладкавання: выбранне краёвага цэнтра ўлады; бясплатная перадача зямлі працоўнаму народу; стварэнне нацыянальнага войска; уздым беларускай культуры; прадстаўніцтва Беларусі на міжнародным мірным кангрэсе. У якасці канчатковай мэты вызначалася ўтварэнне аўтаномнай, дэмакратычнай Беларускай рэспублікі, што на роўных правах з Расіяй і іншымі рэспублікамі павінна ўвайсці ў агульнарасійскі федаратыўны саюз [11, с. 95—98].

Беларускі абласны камітэт (на чале з Я. Канчарам) складаўся галоўным чынам з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на ўсерасійскіх сялянскіх з’ездах і ўвасабляў сілы, якія яшчэ нядаўна да намаганняў «адраджэнцаў» ставіліся варожа. Актывісты БАК у большасці з’яўляліся прыхільнікамі агульнарасійскіх партый эсэраў і энэсаў. Іх нацыянальная самасвядомасць была моцна прасякнута пастулатамі «заходнерусізму», што абумовіла іх адназначна прарасійскую арыентацыю. На першы план яны ставілі клопат пра будучыню не столькі Беларусі, колькі Расіі ў цэлым. З-за вайны, гаспадарчай разрухі, унутрыпалітычнай барацьбы Расія страціла былую магутнасць і ўжо «не мае сілы абараніць гістарычныя межы Беларусі». Страта колішняга моцнага апекуна ў асобе Расіі прымушае і Беларусь паставіць на чаргу пытанне пра свой лёс. Але не для таго, каб нанесці дадатковы ўдар аслабелай імперыі, а «каб сваёй арганізаванай сілай дапамагчы сабе самой і ў той жа час падтрымаць сілы шматпакутнай Расіі». Такім чынам, самавызначэнне Беларусі для «абласнікоў» — гэта вымушаны і не вельмі пажаданы крок, прадыктаваны неспрыяльным збегам знешніх абставін. Хоць у дакументах БАК таксама гучалі ідэі аўтаноміі і федэрацыі, але ў такой інтэрпрэтацыі, якая прадугледжвала для Беларусі статус не рэспублікі, а толькі аўтаномнай вобласці ў складзе Расіі [11, с. 99—102].

Першапачаткова два цэнтры вялі падрыхтоўку з’езда паасобку. Дзеячы БАК, якія разлічвалі на большую падтрымку сялянства, да таго ж атрымалі фінансаванне ад ленінскага СНК, спачатку намерваліся склікаць з’езд асобна ад ВБР і ЦБВР, паміж 10 і 15 снежня 1917 г., у Рагачове — далей ад мінскіх беларускіх арганізацый і ад бальшавіцкага кіраўніцтва Заходняй вобласці і фронту. Вялікая Беларуская рада рассылала запрашэнні з прапановай накіроўваць дэлегатаў на 5 снежня ў Мінск.

Але ўрэшце рэшт ВБР і БАК пайшлі на ўзаемны кантакт, зразумеўшы, што правядзенне двух з’ездаў толькі замацавала б нацыянальную раз’яднанасць, у той час як сітуацыя пільна патрабавала кансалідацыі.

У 20-х чыслах лістапада 1917 г. у Петраградзе, затым у Мінску адбыўся шэраг сустрэч прадстаўнікоў Вялікай Беларускай рады, Беларускага абласнога камітэта, а таксама Беларускай народнай грамады (Масква) з мэтай выпрацоўкі сумеснага плана падрыхтоўкі з’езда. Крыніцы перадаюць атмасферу недаверу і ўзаемнай падазронасці, у якой пачыналася супрацоўніцтва. Але адначасова яны паказваюць, як перад тварам суровых выклікаў гісторыі намацваліся кропкі судакранання, спакваля збліжаліся пазіцыі розных беларускіх арганізаваных асяродкаў [4, с. 140; 7, арк. 90—91].

У выніку сустрэч удалося дамовіцца аб галоўным: Усебеларускі з’езд склікаецца сумесна мінскім і петраградскім цэнтрамі, а месцам яго правядзення можа быць Мінск. Аднак у пытанні пра дату з’езда пагаднення не дасягнулі: ВБР па-ранейшаму настойвала на 5, а БАК спыніўся на 15 снежня.

У першыя дні снежня 1917 г. у Мінск пачалі з’язджацца прадстаўнікі арганізацый, што адгукнуліся на запрашэнне Вялікай Беларускай рады. Увечары 7 снежня, калі ўжо прысутнічала 500 чалавек з вырашальным голасам і 200 — з дарадчым [9, 8 (21) дек.; 10, 8 дек.], Усебеларускі з’езд быў афіцыйна адкрыты.

Урачыстая цырымонія адкрыцця форуму, старанна арганізаваная, спрыяла псіхалагічнаму збліжэнню дэлегатаў, усведамленню імі сваёй місіі як выразнікаў волі адзінага беларускага народа. Апрача таго, афіцыйнае адкрыццё з’езда азначала ўзнікненне інстанцыі, што магла ад імя Беларусі ўступаць у зносіны з органамі ўлады і звяртацца да міжнароднай супольнасці.

У наступныя дні сталі прыбываць дэлегаты, што ішлі за Беларускім абласным камітэтам — пераважна гэта былі пасланцы сялян з усходніх рэгіёнаў Беларусі. Самы інтэнсіўны прыезд удзельнікаў форуму прыпадае на сярэдзіну снежня. «Дэлегаты на Усебеларускі з’езд у Мінску працягваюць штодзённа прыбываць у вялікай колькасці. З’ехалася ўжо больш за 1000 дэлегатаў», — паведамляла 16 снежня 1917 г. газета «Социалист- революционер».

Усяго з 5 па 17 снежня мандатная камісія выдала 1872 мандаты, у тым ліку 1167 — з правам вырашальнага голасу і 705 — з правам дарадчага [1, 16 і 22 крас.; 2, 4 (17) янв.; 5, с. 34—35]. У асобе дэлегатаў на з’ездзе былі прадстаўлены фактычна ўсе больш-менш актыўныя суб’екты тагачаснага грамадска-палітычнага працэсу ў Беларусі: земствы і гарадскія думы, саветы, палітычныя партыі, беларускія нацыянальныя арганізацыі, кааператыўныя, прафесійныя і бежанскія структуры, зямельныя, харчовыя камітэты і г. д. Дэлегаты рэпрэзентавалі ўвесь беларускі этнічны абшар, пра што сведчыла арганізацыя на з’ездзе Віленскага, Гродзенскага, Мінскага, Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага зямляцтваў. У цэлым склад дэлегатаў Усебеларускага з’езда дастаткова адэкватна адлюстроўваў тагачасную структуру і стан пачынаючага ўсведамляць сябе нацыяй беларускага грамадства.

З прыбыццём у Мінск Беларускага абласнога камітэта і яго прыхільнікаў з’езд прыкметна палярызаваўся [3, с. 10—11]. Некалькі разоў ён знаходзіўся на мяжы расколу. Да гэтага падштурхоўвалі таксама пасланцы Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б), накіраваныя на з’езд дзеля яго зрыву.

Зноў спатрэбіліся прымірэнчыя нарады, пагаджальныя камісіі, з дапамогай якіх рабіліся нялёгкія крокі насустрач у імя агульнанацыянальнай згоды. Пэўным дасягненнем у гэтым кірунку стала выбранне прэзідыума з прадстаўнікоў абедзьвюх плыняў, а таксама Рады старэйшын (Рады з’езда),

якая пасля разгону форуму выканала ролю агульнабеларускага палітычнага цэнтра.

Сустрэўшыся, бадай, упершыню ў гісторыі ў адным месцы ў адзін час, лідары абедзвюх арыентацый — «адраджэнцкай» і «заходнярускай» — пры абмеркаванні канкрэтных, злабадзённа-практычных праблем, якімі жыло беларускае грамадства ў канцы 1917 г., знаходзілі ў сабе сілы пакінуць убаку адчужанасць і выпрацаваць узаемапрымальныя рашэнні.

Разглядаючы канкрэтныя праблемы, дэлегаты пераконваліся, што для іх вырашэння ў інтарэсах большасці мясцовага насельніцтва неабходна арганізацыя агульнабеларускага органа ўлады, рэальную сілу якому магло надаць толькі свае войска. Гэта было асабліва відавочным на фоне пачатых 9 снежня 1917 г. у Брэсце мірных перамоў Савецкай Расіі з дзяржавамі германскага блоку. Прадметам вострай занепакоенасці ўсіх дэлегатаў — незалежна ад іх партыйнасці і арыентацыі — з’яўлялася пытанне пра лёс акупаваных немцамі Гродзенскай і Віленскай губерняў, г. зн. пра цэласнасць Беларусі. Але без ўдзелу ў перамовах саміх беларусаў захаванне цэласнасці краю было малаверагодным. Само жыццё вымагала ад Беларусі стаць суб’ектам міжнародных адносін, для чаго патрабавалася здзейсніць акт самавызначэння, закласці асновы нацыянальнай дзяржаўнасці.

15—17 снежня 1917 года Усебеларускі з’езд ушчыльную падыйшоў да гэтага лёсавызначальнага рашэння. Форум зноў моцна палярызаваўся, разгарэліся выключна вострыя дэбаты паміж «радаўцамі» і «абласнікамі» адноста выбару найбольш аптымальнай формы самавызначэння. Падставай для спрэчак стала прапанова «радаўцаў» абвясціць Беларусь рэспублікай у складзе федэратыўнай Расіі. Нават памяркоўная спроба здзейсніць самавызначэнне ў форме рэспублікі як раўнапраўнага суб’екта агульнарасійскай федэрацыі — чым Беларусь да таго часу не з’яўлялася — выклікала ў асяроддзі «абласнікоў» сапраўдны перапалох і ў чарговы раз паставіла з’езд на грань расколу [8, с. 184—188].

Позна ўвечары 17 снежня спрэчкі дасягнулі беспрэцэдэнтнай вастрыні. Быў аб’яўлены перапынак, падчас якога Рада з’езда цаной каласальных высілкаў выпрацавала кампрамісную формулу арганізацыі ўлады: «Замацоўваючы свае права на самавызначэнне, абвешчанае Расійскай рэвалюцыяй, і сцвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі, для выратавання роднага краю і засцярогі яго ад падзелу і адрыву ад Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, 1-ы Усебеларускі з’езд пастанаўляе: неадкладна ўтварыць са свайго складу орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў дзелавыя зносіны з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў» [11, с. 105].

Вынайдзеная формула ўключала матыў Беларускай рэспублікі, але наймення такога не ўтрымлівала, таму яна была прынята ўсімі і пад бурныя авацыі ўхвалена з’ездам. Гэта была яго несумненная перамога — як над уласнымі супярэчнасцямі, так і над раскольніцкай тактыкай заходнефрантавых бальшавікоў.

Прыняццем працытаванай рэзалюцыі з’езд зафіксаваў важны зрух у грамадскай свядомасці тагачасных беларускіх эліт. Беларусь хоць і ўяўлялася па-ранейшаму толькі звяном больш шырокага дзяржаўна-палітычнага

аб’яднання, але ўжо не як безаблічная, жорстка падпарадкаваная цэнтру правінцыя, а як адносна самастойны, раўнапраўны, з уласнымі інтарэсамі, аўтаномнай сістэмай кіравання суб’ект агульнарасійскага супольніцтва народаў і краёў. Такі статус мог паслужыць стартавай пляцоўкай для будучага руху да поўнага суверэнітэту.

Разгон Усебеларускага з’езда сарваў натуральны, легітымны, найбольш цывілізаваны шлях ператварэння беларусаў з аморфнай этнічнай масы ў сучасную суверэнную палітычную нацыю. Далей гэтая трансфармацыя пайшла пакручастымі дарогамі, аказалася запаволенай і шмат у чым дэфармаванай.

Тым не менш з’езд застаецца неардынарнай падзеяй айчыннай гісторыі. Яго скліканнем упершыню была створана агульнабеларуская палітычная пляцоўка, на якой сустрэліся прадстаўнікі розных партыйна-палітычных, ідэалагічных, культурніцкіх плыняў для абмеркавання лёсавызначальных праблем беларускага грамадства. Пры гэтым яны прадэманстравалі здольнасць да кампрамісаў, да выпрацоўкі узаемапрымальных шляхоў прадухілення катастрафічных пагроз, што навіслі над Беларуссю ва ўмовах ваенных і рэвалюцыйных катаклізмаў. Магчыма, якраз апошняй адметнасцю Усебеларускі з’езд 1917 года і мог бы паслужыць урокам для нашчадкаў.

### Спіс літаратуры і крыніц

1. Беларускі шлях. — 1918.
2. Белорусская рада. — 1918.
3. Захарка, В. Галоўныя моманты беларускага руху. (Урывак) / В. Захарка // Спадчына. — 1997. — № 5. — С. 3—17.
4. Канчер, Е. С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов / Е. С. Канчер // Нёман. — 1993. — № 1. — С. 136—167.
5. Кречевский, П. Кто был на 1-м Всебелорусском съезде / П. Кречевский // Варта. — 1918. — № 1. — С. 34—35.
6. Лазько, Р. Р. Аб накірунках уплыву на Беларусь расійскага крызісу 1917 года / Р. Р. Лазько // Ad jubilaeum: Да 70-годдзя стварэння гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта: Зб. навук. артыкулаў. — Ч. 1. — Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. — С. 27—36.
7. НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 2.
8. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. — Мн.: Тэхналогія, 2001. — 202 с.
9. Советская правда. — 1917.
10. Социалист-революционер. — 1917.
11. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. — М.: Гос. изд-во, 1921. 151 с.